УДК 316.77;008

# ПРАЦА КРЭАТЫЎНЫХ ІНДУСТРЫЙ З САВЕЦКІМІ ЭСТЭТЫЧНЫМІ ФОРМАМІ

***А. Д. КРЫВАЛАП***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, вул. Рабкараўская, 17, 220007, г. Мінск, Беларусь*

Даследуецца тэма пераасэнсавання савецкай культурнай спадчыны. Прадстаўлены аўтэнтычныя сведчанні, якія акрэсліваюць магчымасці крэатыўных індустрый у пераасэнсаванні савецкіх эстэтычных форм у сучаснай беларускай штодзённай гарадской культуры. У якасці тэарэтычнай базы выкарыстоўваюцца канцэпцыя эстэтычных форм Г. Маркузэ, ідэя эстэтычнага паўстання Ж. Зубжыцкай і падыход Б. Гройса, згодна з якім савецкасць разумеецца як вялікі стыль. Прапаноўваюцца магчымыя падыходы да пераасэнсавання катэгорыі савецкага ў аспекце эстэтычных пытанняў. Вынікі даследавання публікуюцца ўпершыню.

***Ключавыя словы:*** крэатыўныя індустрыі; эстэтыка; пераасэнсаванне; савецкая культура; практыка.

# РАБОТА КРЕАТИВНЫХ ИНДУСТРИЙ С СОВЕТСКИМИ ЭСТЕТИЧЕСКИМИ ФОРМАМИ

***А. Д. КРИВОЛАП***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет культуры и искусств, ул. Рабкоровская, 17, 220007, г. Минск, Беларусь*

Исследуется тема переосмысления советского культурного наследия. Представлены аутентичные свидетельства, очерчивающие возможности творческих индустрий в переосмыслении советских эстетических форм в современной белорусской повседневной городской культуре. В качестве теоретической основы используются

**Образец цитирования:**
Крывалап АД. Праца крэатыўных індустрый з савецкімі эстэтычнымі формамі. *Человек в социокультурном измерении.* 2021;2:75–80.

**For citation:**
Krivolap AD. The work of creative industries with Soviet aesthetic forms. *Human in the Socio-Cultural Dimension.* 2021;2:75–80. Belarusian.

**Автор:**
***Алексей Дмитриевич Криволап*** – кандидат культурологии; доцент кафедры культурологии.

**Author:**
***Alexei D. Krivolap***, PhD (cultural studies); associate professor at the department of the cutural studies.
*email2krivolap@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0002-4478-4930*

CC BY NC

концепция эстетических форм Дж. Маркузе, идея эстетического восстания Ж. Зубжицкой и подход Б. Гройса, согласно которому советскость понимается как великий стиль. Предлагаются подходы к переосмыслению категории советского с точки зрения эстетики. Результаты исследования публикуются впервые.

***Ключевые слова:*** креативные индустрии; эстетика; переосмысление; советская культура; практика.

# THE WORK OF CREATIVE INDUSTRIES WITH SOVIET AESTHETIC FORMS

***A. D. KRIVOLAP***[a]

[a]*Belarusian State University of Culture and Arts, 17 Rabkaraŭskaja Street, Minsk 220007, Belarus*

The article is devoted to the topic of rethinking the Soviet cultural heritage. The text presents authentic information of the possibilities of creative industries for rethinking Soviet aesthetic forms in modern Belarusian everyday urban culture. The concept of aesthetic forms of G. Marcuse, aesthetic uprising of G. Zubrzyckaya and Sovietness as a great style of B. Groys is used as a theoretical foundation. The article suggests possible approaches to the reinterpretation of the Soviet in terms of aesthetic issues. Results of this study are published for the first time.

***Keywords:*** creative industries; aesthetics; rethinking; Soviet culture; practice.

## Уводзіны

Любыя праявы культуры так ці інакш звязаны з пэўнымі сацыяльнымі нормамі і правіламі. Спробы рэдызайна прасторы былых савецкіх гарадоў непазбежна вядуць да актуалізацыі пытанняў працы з гістарычнай памяццю, магчымасцей яе пераасэнсавання і пераадолення наяўных траўм. Нават калі не ставяцца задачы дэсаветызацыі, наяўныя культурныя нормы і практыкі ўсё роўна так ці інакш закранаюцца.

Падчас даследавання гарадскіх крэатыўных індустрый у Беларусі дастаткова нечакана для аўтара ўзнікла пытанне эстэтыкі. Звычайна пры разглядзе тэм новых медыя ці IT можна пачуць нешта пра UX-дызайн інтэрфейсаў, юзабіліці і іншыя прыкладныя рэчы, але пры гэтым не ўжываюцца эстэтычныя катэгорыі. Разам з тым падчас глыбінных інтэрв'ю эксперты раз-пораз закраналі тэмы эстэтычнага пераасэнсавання, адмаўлення ад пэўных культурных канонаў ці нават непрымання таго, што супярэчыць іх эстэтычным пачуццям.

У часы Антычнасці пытанні эстэтыкі ўпершыню ў еўрапейскай гісторыі былі непасрэдным чынам сфармуляваны, і да сёння яны застаюцца актуальнымі і хвалююць не толькі прадстаўнікоў культуры ці творчай інтэлігенцыі. Эстэтыка выступае як складнік таго ці іншага ладу жыцця. На фоне сур'ёзных каштоўнасных пытанняў да савецкага мінулага крытычнае стаўленне да савецкай эстэтыкі не выглядае чымсьці нечаканым. Пераасэнсаванне савецкага мінулага варта пачынаць не з палітычных ці эканамічных аспектаў, а з эстэтычных і культурных пытанняў. Пры гэтым было б перабольшаннем разважаць пра цэльны і маналітны савецкі эстэтычны праект.

Мэта дадзенага артыкула – паказаць атрыманыя падчас эмпірычнага даследавання сведчанні, якія акрэсліваюць магчымасці крэатыўных індустрый для пераасэнсавання катэгорыі савецкага ў сучаснай штодзённай гарадской культуры.

## Тэарэтычныя асновы даследавання

У даследаваннях савецкага мінулага эстэтычныя пытанні закранаюцца нячаста. Але паспяховасць сацыяльна-культурных трансфармацый грамадства істотна залежыць ад здольнасці засвоіць уласную гісторыю. Гэты артыкул у тэарэтычным плане абапіраецца на кнігу Г. Маркузэ «Эстэтычнае вымярэнне: да крытыкі марксісцкай эстэтыкі» [1], якая не перакладалася на беларускую і рускую мовы, а таксама на працу Б. Гройса «*Gesamtkunstwerk* Сталин» [2].

Г. Маркузэ звяртаецца не да эмпірычнай савецкай культурнай практыкі, а да марксісцкай канцэпцыі культуры. Аўтар адстойвае права культуры ў шырокім сэнсе не быць толькі другаснай часткай над-

будовы, якая цалкам залежыць ад базісу. Для Г. Маркузэ мастацтва само па сабе ва ўласных эстэтычных формах валодае патэнцыялам для сацыяльных трансфармацый. І асобая роля ў гэтым працэсе адводзіцца аўтаномнасці мастацтва і творцы. Палітычны патэнцыял мастацтва знаходзіцца толькі ўнутры яго ўласнага эстэтычнага вымярэння, якое даследчык называе эстэтычнай формай, якая «выдаляе мастацтва з рэчаіснасці класавай барацьбы – з рэальнасці чыстай і простай. Эстэтычная форма складае аўтаномію мастацтва ў адносінах да “дадзенага”»[1] [1, p. 8]. Пры гэтым «эстэтычная форма не супрацьпастаўляецца зместу, нават дыялектычна. У мастацкім творы форма становіцца зместам, і наадварот» [1, p. 41].

Крытыкуючы татальнасць марксісцкай канцэпцыі культуры, Г. Маркузэ прапануе ўласнае бачанне магчымасці аўтаномнасці мастацтва. На яго думку, «аўтаномія мастацтва адлюстроўвае несвабоду людзей у несвабодным грамадстве. Калі б людзі былі свабодныя, мастацтва з’яўлялася б формай і выражэннем іх свабоды. Мастацтва застаецца адзначаным несвабодай; супярэчачы яму, мастацтва дасягае сваёй аўтаноміі» [1, p. 72–73]. Адметную ролю ў гэтым працэсе выконваюць уяўленне і іншыя працэсы, якія злучаюць свядомасць і падсвядомасць, калі «мімесіс пераводзіць рэальнасць у памяць. У гэтай памяці мастацтва прызнала, што ёсць і што можа быць у сацыяльных умовах і па-за імі» [1, p. 67]. Гэта, у сваю чаргу, адкрывае магчымасці для стварэння эстэтычных форм утапічных праектаў, якія будзе вельмі складана адрозніваць ад сапраўдных. Калі рэальнасць залежыць ад успамінаў, якія не з’яўляюцца нязменнымі, то ўзнікае небяспека маніпуляцый і злоўжыванняў: «Утопія ў вялікім мастацтве – гэта заўсёды не простае адмаўленне прынцыпу рэальнасці, а яго трансцэндэнтнае захаванне, пры якім мінулае і сучаснасць кідаюць свой цень на здзяйсненне. Сапраўдная ўтопія грунтуецца на ўспамінах» [1, p. 73]. Але сувязь паміж успамінамі, утопіямі і эстэтычнай формай стварае неверагодныя магчымасці для працы з грамадствам і культурай, што дастаткова актыўна выкарыстоўваецца ў рэкламе.

Г. Маркузэ здзекліва паказвае абмежаванні сацыялістычнага праекта, падкрэсліваючы, што «сацыялізм не вызваляе і не можа вызваліць Эрас ад Танатаса» [1, p. 72]. Толькі «мастацтва ўяўляе канчатковую мэту ўсіх рэвалюцый: свабоду і шчасце чалавека» [1, p. 69].

Цікавы працяг аналізу ролі і месца эстэтычных форм мастацтва можна знайсці ў працах Б. Гройса, які прапануе радыкальную спробу разглядаць савецкасць як вялікі стыль ці завершаны эстэтычны канон, які немагчыма звесці да сацыялістычнага рэалізму ці нейкіх іншых дакладна апісаных мастацкіх практык. Гэты новы вялікі стыль імкнуўся да татальнага і ўсеабдымнага характару кантролю над жыццём грамадства. Цэнтральным тэкстам Б. Гройса з’яўляецца праца «*Gesamtkunstwerk* Сталин». У перакладзе з нямецкай мовы *Gesamtkunstwerk* – гэта завершаны цэльны твор мастацтва, які закранае ўсе аспекты і сферы культурнай дзейнасці.

У адрозненне ад мноства даследаванняў, прысвечаных тэорыі сацыялістычнага рэалізму, канцэпцыя Б. Гройса дае метаапісанне і інтэрпрэтацыю механізмаў яго функцыянавання. Сацыялістычны рэалізм разглядаецца як вынік палітызацыі эстэтыкі ці адначасова эстэтызацыі палітыкі: «Сталінская эстэтыка і практыка зыходзілі з той жа канцэпцыі выхавання, фарміравання мас, для якой Сталін выкарыстаў “перакручаную” авангардысцкіх метафару “Пісьменнікі – інжынеры чалавечых душ”» [2, c. 60]. Б. Гройс выказвае меркаванне, што мяжой паміж эстэтыкай авангарда сацрэалізму можа быць стаўленне да класічнай культурнай спадчыны, магчымасці рэпрэзентацыі рэчаіснасці і задачы стварэння новага (савецкага) чалавека. На думку даследчыка сацыялістычны рэалізм паўстаў не ў выніку адмаўлення ад авангарду, а як яго максімальна магчымая радыкалізацыя: «Сацыялістычны рэалізм арыентуецца на тое, чаго яшчэ няма, але што павінна быць створана, і ў гэтым ён спадкаемца авангарду, для якога эстэтычнае і палітычнае таксама супадаюць» [2, c. 78]. Гэта тая самая ўтапічная эстэтычная форма Г. Маркузэ, якая грунтуецца на ўспамінах.

Але адмаўленне і ігнараванне савецкага эстэтычнага канона не вырашае праблемы пераасэнсавання савецкай спадчыны. Б. Гройс прыходзіць да радыкальнай высновы, што дзеля пераадолення спадчыны савецкай эстэтыкі яе трэба засвоіць, і толькі пасля гэтага з’явіцца магчымасць рухацца далей: «Ад Сталіна аказалася немагчыма вызваліцца, не паўтарыўшы яго, па меншай меры эстэтычна...» [2, c. 159].

У выніку рэалізацыі радыкальнага савецкага эстэтычнага праекта паўстала новая супольнасць – савецкі народ: «Калі ў выніку такой працы атрымалася стварыць штучную падсвядомасць, штучны кантэкст, новыя і яшчэ нябачаныя машыны жадання, напрыклад “савецкі народ”, то раптам высвятляецца, што гэтыя машыны здольныя пражыць такія жыцці і спарадзіць такія тэксты, якія нічым не адрозніваюцца ад натуральных. Адрозненне паміж натуральным і штучным становіцца, такім чынам, нерэлевантным. Гэтыя дзіўныя істоты са штучнай падсвядомасцю, але з натуральнай свядомасцю...» [2, c. 161].

Цікава, што эксперты не згадваюць Б. Гройса і не спасылаюцца на яго працы, але выказваюцца ў падобным рэчышчы, разглядаючы савецкую спадчыну ў тым ліку як пэўны эстэтычны канон. Ідэя

[1]Тут і далей пераклад наш. – *А. К.*

непрымання савецкага эстэтычнага канона прадстаўнікамі крэатыўных індустрый можа разумецца як варыяцыя эстэтычнага паўстання, калі замест наяўных, але незадавальняючых культурных практык людзі імкнуцца да новых, у першую чаргу эстэтычных, форм, нават не ўсведамляючы, што гэта і ёсць новая культурная рэвалюцыя, якая выкарыстоўвае логіку і механізмы культурнай гегемоніі, скіраванай на дамінаванне ў сацыяльна-культурнай сферы. Эстэтычнае дзеянне з’яўляецца сацыяльным нават тады, калі ажыццяўляецца без неабходнага ўзроўню рэфлексіі.

Таксама варта прыгадаць канадскі прыклад 1960-х гг. з франкамоўнай правінцыі Квебек, дзе і дагэтуль адчуваецца напружанасць паміж англамоўнай і франкамоўнай культурнымі супольнасцямі, як узор пераадолення эстэтычных праблем. На думку Ж. Зубжыцкай, гэта магчыма «назваць “эстэтычнае паўстанне”, двайны працэс, пры якім сацыяльныя суб’екты змагаюцца са знакавымі сімваламі ў грамадскай сферы і перарабляюць іх; гэтыя сімвалы пры дапамозе матэрыяльных маніпуляцый набываюць значэнні, якія падштурхоўваюць да артыкуляцыі новых ідэнтычнасцей і даюць імпульс інстытуцыйным рэформам. Матэрыяльныя сімвалы і вобразы ўдзельнічаюць у стварэнні сацыяльнага, ажыццяўляючы тое, што П. Штомпка назваў момантамі “сацыяльнага станаўлення”» [3, p. 10]. Ідэя эстэтычнага паўстання супраць наяўнай эстэтычнай нормы выкарыстоўваецца і для таго, каб зразумець працэсы, якія адбываліся ў Квебеку. Выкарыстанне ідэі эстэтычнага паўстання дае магчымасць патлумачыць поспех і папулярнасць крэатыўных індустрый у Беларусі.

## Матэрыялы і метады даследавання

Дадзены артыкул грунтуецца на выніках якаснага эмпірычнага даследавання, якое было праведзена ў традыцыях абгрунтаванай тэорыі (*grounded theory*) на падставе даследчых экспертных інтэрв’ю. Гутаркі праводзіліся на беларускай і рускай мовах. Эмпірычная частка даследавання была рэалізавана вясной і летам 2018 г. Большасць інтэрв’ю праходзілі ў трансфармаваных публічных прасторах, пабудаваных у савецкі час, якія, дзякуючы дзейнасці крэатыўных індустрый, ператварыліся ў кавярні, каворкінгі і опэнспейсы, што з’яўляюцца відавочным прыкладам пераасэнсавання савецкага эстэтычнага канона. Выкарыстоўвалася тэарэтычная выбарка. Транскрыпты інтэрв’ю апрацоўваліся ў аналітычнай праграме *MaxQDA* 2018. У тэксце артыкула прыводзяцца фрагменты гутарак. Спасылкі на іх афармлены па наступнай схеме: *Словы эксперта* <152.19.46:20>, дзе лічбамі ў вуглавых дужках закадзіраваны працягласць, мова і дата інтэрв’ю, а таксама нумар абзаца ў транскрыбіраваным тэксце размовы (фрагменты рускамоўных прамоў экспертаў прыводзяцца ў даслоўным перакладзе на беларускую мову).

## Вынікі і іх абмеркаванне

Эмпірычнае даследаванне прадставіла цікавыя сведчанні таго, якім чынам дзейнасць крэатыўных індустрый можа істотна ўздзейнічаць на пераасэнсаванне феномена савецкага ў сучаснай штодзённай гарадской культуры.

Цяпер больш заўважныя спробы не быць падобным на савецкі эстэтычны канон. У гэтым кантэксце *дэсаветызацыя – гэта пераасэнсаванне, гэта частка сутнасці той вытворчасці, якая тут стварае* <190.19.52:22>. Гэта як падвойная рэфлексія – рэфлексія над рэфлексіяй. Часам заўважаецца больш спрошчанае разуменне працэсу пераасэнсавання: *Мы гаворым пра тое, што крэатыўныя індустрыі – гэта фабрыкі брэндаў. Савецкае – гэта наш брэнд! Большая частка турыстаў едзе, каб паглядзець на апошнюю савецкую краіну, у якой нічога не памянялася. Так чаму б гэта не эксплуатаваць? Вось яно на дарозе ляжыць, а нам падаецца, што мы вышэй за гэта* <184.58.80:58>. Зразумела, што прыведзеная цытата – толькі меркаванне, а не абсалютны закон жыцця, ёсць выключэнні: *З пункта гледжання брэндынгу, пабудовы брэнда, вядомасці World of Tanks – гэта адзін з самых магутных брэндаў Беларусі, і ён звяртаецца да чаго?* <192.58.54:46>. Калі мы кажам пра *World of Tanks* па-за межамі інтэрнэтпрасторы, то гэта і будзе прыкладам максімальнай эксплуатацыі савецкай спадчыны. З іншага боку, савецкая мілітарызаваная спадчына ў выглядзе танкаў можа быць трансфармавана ў нечаканыя эстэтычныя праблемы дзіцячых садкоў: *Людзі гатовыя траціць грошы на прыватны дзіцячы садок... каб дзіцё не хадзіла клеіць танкі да 23 лютага – гэта пра эстэтыку!* <102.19.42:64>.

Чалавечы фактар мае пэўныя сацыяльна-культурныя межы, у якіх ён быў сфарміраваны: *Крэатыўныя індустрыі – гэта паняцце постындустрыяльнага грамадства, калі сапраўды галоўным рэсурсам, на які звяртаюць увагу, становіцца чалавечы патэнцыял* <151.58.82:10>. Калі інтэрпрэтацыя сучаснай беларускай культуры штодзённасці сутыкаецца з праявамі савецкіх культурных канонаў і *там не толькі вышыванкі, а куча ўсяго, гэта эстэтычнае пытанне і гатоўнасць інтэрпрэтаваць усю тую беларускасць па-новаму, ці негатоўнасць* <130.58.58:123>.

Але часцей канфлікт з савецкім эстэтычным канонам праяўляецца ў разуменні прыгажосці ці таго, што мае права называцца прыгожым. Калі ў савецкі час крышталёвыя вазы і дываны на сценах былі

доказам добрага густу і паказвалі дабрабыт гаспадароў кватэры, то на сёння гэта ўспрымаецца хутчэй адмоўна, як праява мяшчанства. Але запыт на прыгажосць застаўся, і ён больш заўважны, чым прага адукацыі і разуменне гісторыі мастацтва. Значна прасцей звярнуцца да дызайнера з патрабаваннем раскошы і просьбай зрабіць усё прыгожа! Менавіта ў гэтым і праяўляюцца супярэчнасці савецкага эстэтычнага канона і сучасных тэндэнцый крэатыўных індустрый. Прага прыгажосці можа тлумачыцца наступным чынам: *Нам галоўнае пераадолець галечу, і вось мы пачынаем усё адпрасоўваць. Гэта адзін бок эстэтыкі. Другі бок эстэтыкі – у супрацьвагу гэтаму: у крэатыўных індустрыях у фокусе адкрытасць, інтэрактыўнасць, магчымасць узаемадзейнічаць. <...> Трэцяе – офісы вельмі прасунутых кампаній, якія спрабуюць балансаваць, спрабуюць выбудаваць якраз гібрыдную эстэтыку, каб было даволі гладка і даволі чыста, але і даволі інклюзіўна* <192.58.78:12>. Невытлумачальная прага раскошы ў аздабленні інтэр’ераў ці нейкія іншыя праявы шыку можна патлумачыць тым, што *яны таксама яшчэ галодныя, у іх было галоднае жыццё, дзяцінства ў культурным сэнсе* <179.19.35:4>.

Эмацыянальнае і, відавочна, балючае стаўленне да савецкага мінулага звязана з сацыяльна-культурнай траўмай, якой стаў распад СССР. Траўма, якая не адпускае, на пераасэнсаванне і разуменне якой проста няма часу, і не хапае ведаў пра тое, як гэта можна зрабіць. Адна татальная няўпэўненасць: а ці правільна мы робім? *Нейкая частка людзей да гэтага часу жыве ў савецкім мінулым. <...> Траўма савецкага, яна ёсць. Напэўна, асэнсаванне робіцца вельмі малой колькасцю людзей* <192.58.58:32>. Часам гэта ўказвае на траўматычнае нядаўняе мінулае, тое, што яшчэ баліць. *Гэта значыць, вельмі моцная траўма, калі я проста хачу забыцца і не нагадвайце мне. Такая вось рэакцыя ў некаторых на дызайн, калі ён нагадвае савецкае, я думаю, гэта вельмі моцная траўма, і, можа быць, якраз крэатыўныя індустрыі маглі б пацiху падыходзіць* <192.58.58:40>. Асэнсаванне – гэта як здольнасць адчужэння і продажу ўласнага мінулага. Тут гаворка пра псіхааналітычны падыход да працы з калектыўным мінулым, з тым, што з гэтага мы памятаем, а што імкнемся забыць. Калі задача не забыць з дапамогай выцяснення, а зразумець і прапрацаваць пытанні пра тое, чаму і што баліць. *Савецкае, яно проста самае блізкае, і ёсць яшчэ пакаленне, якое нарадзілася там і жыло там. <...> Таму гэта савецкае, яно з намі яшчэ, і таму яно больш перажываецца, так востра* <088.19.54:17>. Гэта ўскладняе працу па пераасэнсаванні мінулага: *Мы намагаемся працаваць часткова з савецкай гісторыяй. Яна, мне падаецца, настолькі яшчэ жывая, і частка грамадства Беларусі савецкае. Яны як бы недакладна падзяляюць сябе: вось было савецкае, яно скончылася* <139.19.40:40>. Уцямнага адказу на пытанне пра тое, чым скончылася, проста няма. Было і больш няма, а куды падзелася – гэта таямніца.

Магчыма, пераасэнсаванне савецкага – гэта не першасная задача для крэатыўных індустрый. Перш за ўсё ім неабходна выжыць. Але як адна з наступных задач яго можа выступаць абсалютна дакладна. *Прынамсі, у нашай стратэгіі дэсаветызацыя – гэта азначае працу з савецкім, пераасэнсаванне, вывучэнне, тых норм, якія ёсць. Дэканструкцыя, крытыка, а не проста нешта новае. <...> Зразумела, што з гэтым трэба працаваць. Яно само не знікае, яно прыжылося, яно муціруе і дэфармуецца, і зараз увогуле вельмі цікавыя формы. Калі ўжо тое, што не з’яўляецца савецкім, насамрэч моцна муціраваўшае, як бы абасноўваецца ці прымаецца як савецкае і гэта надае яму сілы* <190.19.52:24>. Тут магчымыя розныя крайнасці, якім няпроста суіснаваць, – ад адмаўлення да фанатызму: *Менавіта пераасэнсаванне спадчыны, а не яе татальная крытыка альбо яе татальная прыняцце. <...> Ты павінен мінулае прыняць, ты павінен яго прааналізаваць, ты павінен нейкія з яго эпізоды прызнаць паспяховымі, нешта прызнаць эпізодамі няўдалымі, але падараваўшымі табе класны досвед. Прызнаць і потым далей ісці. Я лічу, што… толькі крэатыўныя індустрыі могуць гэту псіхатэрапію культурную правесці* <192.58.78:32>. Да савецкага патрэбна выпрацаваць адпаведнае стаўленне: *Мы такія нашчадкі, наколькі адчуваем сябе паслядоўнікамі савецкага* <139.19.40:42>. Савецкае сёння рэтрансліруецца ў выглядзе псеўдасавецкага і далёка не заўсёды з глыбокім асэнсаваннем. Калі звярнуцца да пытання засваення гарадской прасторы, то можна знайсці спробы *асэнсаваць, зразумець, што гэта, рэканструяваць, зразумець месца ў горадзе. <...> Глядзіце, мы не на голым месцы знаходзімся, у нас ёсць гісторыя* <162.58.61:67>. Крэатыўныя індустрыі ўзнікаюць у месцах з магчымым сацыяльна-культурным напружаннем. Інакш яны не будуць закранаць аўдыторыю і прываблiваць да сябе. Гэты канфлікт узнікае таму, што вымушаны сутыкацца асобы, якія ўжо працяглы час існуюць як бы ў паралельных галактыках: *...паралельна існуе вуліца Кастрычніцкая са сваёй сістэмай каштоўнасцей, са сваімі нейкімі прыярытэтамі, ну і паралельна таксама праспект з танкамі* <139.19.40:62>. Адваротная стратэгія ўхілення ад канфліктаў і супярэчнасцей вядзе да таго, што працэс пераасэнсавання будзе пазбаўлены ўласна пераасэнсавання і зведзены да замены шыльд ці скарачэння таго, што на іх напісана. Так, кіёскі «Белсаюздрук» паступова з дапамогай рэдызайна ператвараюцца ў «Белдрук».

Ідэя непрымання савецкага эстэтычнага канона прадстаўнікамі крэатыўных індустрый можа быць патлумачана як варыяцыя эстэтычнага паўстання, калі замест наяўных, але незадавальняючых культурных

практык людзі імкнуцца да новых, у першую чаргу эстэтычных, узораў, нават не ўсведамляючы, што гэта і ёсць новая культурная рэвалюцыя. Калі *чалавек сам уключыўся ў крэатыўныя індустрыі, хаця б як наведвальнік кавярні, ён прымае ў першую чаргу гэту эстэтыку. Пачынаецца з эстэтыкі. Ён пачынае любіць кавярню з барадатым барменам і моладдзю, якая сядзіць навокал. Праз гэта ён пачынае прымаць з часам усё, што адбываецца ў крэатыўных індустрыях* <192.58.78:8>.

Падсумоўваючы, варта адзначыць, што эстэтычнае дзеянне – гэта дзеянне сацыяльнае, аднак да рэфлексіі на гэты конт яшчэ далёка. Зараз *усё перацякае ў Wargaming ў гэтыя World of Tanks, усе гэтыя танчыкі. <...> ...І няма аніякага асэнсавання, што гэта была за эпоха, ніякіх этычных высноў* <162.58.61:81>. Перавод у практычную плоскасць выкарыстання эстэтыкі з'яўляецца непазбежным, і гэта толькі пытанне часу.

## Высновы

Пераасэнасаванне савецкага можа пачынацца з адчування эстэтычнага несупадзення з ім. Гэта непалітычны, не эканамічны ці нейкі іншы фактар, а проста эстэтычнае пытанне. Інтэрпрэтацыя сучаснай беларускай культуры штодзённасці сутыкаецца з праявамі савецкіх культурных канонаў. Канфлікт з савецкім эстэтычным канонам праяўляецца ў разуменні прыгажосці ці таго, што мае права называцца прыгожым і абмяжоўваецца ім. Але пытанне значна больш глыбокае. Калі ў выніку рэалізацыі радыкальнага савецкага эстэтычнага праекта паўстала новая супольнасць – савецкі народ, то гэта не толькі пра ўяўленне аб прыгожым. Савецкія эстэтычныя формы імкнуцца захаваць месца ў прасторы гарадоў, але застаюцца незразумелымі. Сувязь паміж успамінамі, утопіямі і эстэтычнай формай адкрывае шырокія магчымасці для працы з грамадствам і культурай. Цікавае супадзенне: некаторыя інтэрв'ю адбываліся ў мінскай кавярні «Утопія», інтэр'ер якой быў стылізаваны пад савецкую эстэтыку 1960-х гг. Успаміны, утопія і эстэтычныя формы – гэта плённая трыяда для працы крэатыўных індустрый з савецкім эстэтычным канонам, калі трансфармуецца не аб'ект, а стаўленне суб'екта да яго. Самым яскравым тут можа быць прыклад з гранёнай шклянкай – тым самым савецкім культавым посудам, без якога немагчыма ўявіць ні сталовую, ні аўтамат з газіроўкай. Але зараз гранёныя шклянкі, вырабленыя на тым жа заводзе ў Расіі, прысутнічаюць на паліцах крам IKEA і ўспрымаюцца не як прыклад савецкай эстэтыкі, а як праявы сучаснага скандынаўскага дызайну. Гэта можа быць алгарытмам працы з савецкай спадчынай.

Менавіта сфера крэатыўных індустрый спрабуе сёння далучыцца да пераасэнсавання савецкага пад выглядам рэдызайна і ў сферы візуальнай рэпрэзентацыі. Але гэта не толькі змена лагатыпаў і скарачэнне назваў, але і спроба пераасэнсаваць ролю і функцыі эстэтычных форм у грамадстве. Новая культура ўтвараецца на падставе дзеянняў асобных індывідаў, сістэматычны характар такіх дзеянняў сведчыць пра з'яўленне новай практыкі.

Ступень крытычнага стаўлення да савецкага эстэтычнага канона сярод прадстаўнікоў крэатыўных індустрый часам настолькі высокая, што можна казаць пра эстэтычнае паўстанне, якое разумеецца як імкненне індывідаў адмовіцца ад распаўсюджаных сацыяльна-культурных практык ці замяніць іх на прынцыпова новыя. Гэтыя эстэтычныя дзеянні з'яўляюцца сацыяльнымі, нават у тым выпадку, калі яны ажыццяўляюцца без неабходнага ўзроўню рэфлексіі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Marcuse H. *The aesthetic dimension. Toward a critique of Marxist aesthetics*. Boston: Beacon Press; 1978. 88 p.
2. Гройс Б. *Gesamtkunstwerk Сталин*. Москва: Ad Marginem; 2013. 168 с.
3. Zubrzycki G. *National matters: materiality, culture, and nationalism*. Stanford: Stanford University Press; 2017. 277 p.

## References

1. Marcuse H. *The aesthetic dimension. Toward a critique of Marxist aesthetics*. Boston: Beacon Press; 1978. 88 p.
2. Groys B. *Gesamtkunstwerk Stalin*. Moscow: Ad Marginem; 2013. 168 p. Russian.
3. Zubrzycki G. *National matters: materiality, culture, and nationalism*. Stanford: Stanford University Press; 2017. 277 p.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 30.06.2021.*
*Received by editorial board 30.06.2021.*